**І.А.Барэйша,**
*кандыдат педагагічных навук, дацэнт, дэкан магістратуры НІА.*
**В.У.Чэчат,**
*кандыдат педагагічных навук, дацэнт, загадчык кафедры педагогікі магістратуры НІА*

# Патрабаванні да магістэрскай дысертацыі па педагогіцы

*Пасля апублікавання у "Настаўніцкай газеце" (№101 за 1995 г.) Часовага палажэння аб магістратуры Нацыянальнага інстытута адукацыі у дэканат магістратуры звяртаюцца работнікі установ адукацыі, настаўнікі, выкладчыкі і студэнты ВНУ з просьбай больш падрабязна расказаць, як стаць магістрам педагогікі, якія патрабаванні прад'яуляюцца да яго падрыхтоукі, да напісання магістэрскай дысертацыі.*
*Увазе чытачоу, якіх цікавяць гэтыя пытанні, прапануем наступныя матэрыялы.*

Магістэрская дысертацыя па педагогіцы з'яуляецца самастойным навуковым даследаваннем, якое выконваецца пад кіраўніцтвам навуковага кіраўніка. Пры яе падрыхтоуцы неабходна прадэманстраваць уменне працаваць з першакрыніцамі і весці доследна-эксперыментальную работу.

Аб'ём магістэрскай дысертацыі не павінен перавышаць 50 машынапісных старонак (38--40 радкоу на 1 старонцы праз 1,5 інтэрвалу). Яна пішацца на беларускай ці рускай мове, складаецца з уводзін, 2 глаў (з кароткімі вывадамі у канцы кожнай), заключных вывадау, спіса выкарыстаных крыніц (не менш чым 50 назвау, у тым ліку на замежных мовах) і дадаткау.

Змест дысертацыі, асабліва яе тээрэтычнай часткі, не павінен насіць рэфератыўны характар. Неабходна, каб ён утрымліваў навізну праблемы ці элементы навізны. Другая (практычная) глава павінна раскрываць уменне будучага магістра самастойна планаваць і праводзіць доследна-эксперыментальную работу, аналізаваць і абагульняць атрыманыя у ходзе даследавання вынікі, ажыццяўляць іх статыстычную (матэматычную) апрацоуку, якасны аналіз, рабіць высновы і выходзіць на узровень навукова-метадычных і практычных рэкамендацый.

Работа над дысертацыяй ажыццяуляецца на працягу усяго тэрміну навучання у магістратуры і заканчваецца, як мінімум, за тры тыдні да яе прадстаулення да абароны. Навуковыя кіраунікі на працягу першага месяца навучання прапануюць студэнтам для азнаямлення, асэнсавання і выбару тэмы магістэрскіх дысертацый (улічваюцца таксама прапановы саміх студэнтау). Тэмы дысертацый зацвярджаюцца на пасяджэнні кафедры педагогікі не пазней сярэдзіны 1-га семестра бягучага года навучання. Пры выбары тэмы магістэрскіх даследаванняу перавага аддаецца тым, якія звязаны з будучай практычнай дзейнасцю магістра.

## Праграма па педагогіцы для субяседавання і уступных экзаменау у магістратуру

### І. Агульныя асновы педагогікі

Педагогіка -- навука аб выхаванні. Педагогіка як навука і мастацтва. Асноўныя катэгорыі педагогікі. Метадалагічныя асновы педагогікі. Сувязь педагогікі з іншымі навукамі (філасофіяй, псіхалогіяй, генетыкай, фізіялогіяй, сацыялогіяй і інш.). Нацыянальныя асаблівасці выхавання. Паняцце аб этнапедагогіцы.

Выхаванне -- вечная, агульная і гістарычная катэгорыя. Выхаванне і сацыялізацыя. Мэта і задачы выхавання. Усебаковае, гарманічнае развіццё асобы як ідэал выхавання. Паняцце аб асобе і яе развіцці. Асоба ў грамадстве і мікраасяроддзі. Правы асобы на жыццё, годнасць, свабоду, адукацыю. Метады навукова-педагагічных даследаванняў і асаблівасці іх выкарыстання. Сістэмны падыход у педагогіцы.

**II. Праблемы тэорыі выхавання**

Праблема суадносін спадчыннасці, асяроддзя і выхавання ў развіцці асобы.

Актыўнасць -- якасць чалавека. Патрэбнасці як крыніца актыўнасці. Фарміраванне патрэбнасцей -- галоўная задача выхавання.

Паняцце аб дзейнасці. Адзінства дзейнасці і свядомасці. Развіццё як вынік актыўнасці і дзейнасці чалавека. Сумесная дзейнасць выхавацеля і выхаванцаў у працэсе развіцця асобы. Двухбаковы характар выхавання. Патрабавальнасць выхавацеля. Віды патрабаванняў. Адзінства патрабавальнасці і павагі да выхаванцаў. Педагогіка паралельнага дзеяння.

Арганізацыя жыццядзейнасці выхаванцаў як спосаб іх развіцця. Састаўныя часткі дзейнасці. мэтамеркаванне, планаванне, асабістая дзейнасць, дыягностыка, карэкцыя. Асноўныя віды сумеснай дзейнасці выхавацеля і выхаванцаў. Спалучэнне педагагічнага кіраўніцтва з самадзейнасцю выхаванцаў.

Зносіны (узаеміны) -- састаўная частка дзейнасці. Паняцце аб зносінах, камунікацыі, камунікабельнасці. Спецыфіка педагагічных зносін. Стылі зносін. Культура зносін. Моўныя здольнасці педагога, іх развіццё.

Рэфлексія, яе значэнне. Выхаванне, самавыхаванне, перавыхаванне.

Фарміраванне навуковага светапогляду ў выхаванцаў.

Патрыятычнае і інтэрнацыянальнае выхаванне.

Маральнае выхаванне. Выхаванне гуманізму, міласэрнасці, паважлівых адносін да бацькоў, навакольных людзей, малых дзяцей, дзяцей-сірот і інвалідаў, састарэлых і нямоглых; беражлівыя адносіны да прыроды і маёмасці. Экалагічнае выхаванне.

Працоўнае выхаванне. Выхаванне творчых адносін да працы. Эканамічнае выхаванне, яго роля ў падрыхтоўцы школьнікаў да працоўнай дзейнасці. Сістэма прафесійнай арыентацыі школьнікаў. Прававое выхаванне і яго функцыі ў папярэджанні правапарушэнняў моладзі.

Эстэтычнае выхаванне. Пераадоленне негатыўных з'яў у эстэтычным выхаванні школьнікаў. Псіхафізічнае выхаванне, яго роля ва ўмацаванні здароўя. Здаровы лад жыцця.

Педагагічныя асновы сямейнага выхавання.

Узаемаадносіны паміж свецкім і рэлігійным выхаваннем.

Дзіцячыя і маладзёжныя арганізацыі, аб'яднанні і рухі ў Беларусі: гісторыя і сучаснасць.

Метады і сродкі выхавання. Слова, дзейнасць, адносіны як сродкі выхавання. Метады выхавання.

Слоўныя (вербальныя) метады педагагічнага дзеяння: слова педагога, дыялог, перакананне, патрабаванне, гутарка, дыспут, дыскусія, канферэнцыя і інш.

Практычныя метады выхавання: прывучэнне, адцягненне, практыкаванне, арганізацыя дзейнасці выхаванцаў, трэніроўка, станоўчы прыклад, паказ узору.

Метады педагагічнага стымулявання: перспектыва, матывацыя дзейнасці, спаборніцтва, напамін, кантроль, стымуляванне да самакантролю, заахвочванне і пакаранне. Віды заахвочвання і асаблівасці іх выкарыстання. Узрост выхаванцаў і заахвочванне. Пакаранне. Улік узроставых і індывідуальных асаблівасцей пры выкарыстанні пакаранняў. Недапушчальнасць пакаранняў, якія зневажаюць годнасць асобы, перашкаджаюць

развіццю асобы. Гуманнасць выхавання. Выхаванне без пакаранняў.

### III. Тэорыя навучання

Паняцце аб дыдактыцы. Яе прадмет і задачы. Асноўныя паняцці дыдактыкі. Роля фізіялогіі, псіхалогіі, кібернетыкі, эрганомікі ва удасканаленні тэорыі навучання. Дыдактыка і прыватныя методыкі. Дыдактычныя тэорыі і іх развіццё.

Тэорыя пазнання як метадалагічная аснова навучання. Заканамернасці і прынцыпы навучання, іх узаемасувязь. Адзінства адукацыйнай, выхаваўчай і развіццёвай функцый навучання.

Тэндэнцыі і напрамкі рэфармавання агульнаадукацыйнай школы Беларусі. Навукова-метадычныя патрабаванні да вучэбных планаў, праграм, падручнікаў.

Сутнасць і структура працэсу навучання, яго асноўныя кампаненты і сувязь паміж імі. Асноўныя звёны (этапы) працэсу навучання.

Метады і сродкі навучання, іх класіфікацыя. Выкарыстанне актыўных метадаў навучання: паратэатр, разыгрыванне роляў, дыскусія, палеміка, "круглы стол", мазгавая атака (штурм), сінектыка, трэнінг, відэатрэнінг, дзелавая гульня і інш.

Формы арганізацыі навучання ў школе. Урок як асноўная форма арганізацыі навучання, выхавання і развіцця. Тыпы урокаў. Разнастайнасць сучасных форм арганізацыі навучання.

Метады праверкі і ацэнкі ведаў, уменняў і навыкаў вучняў. Крытэрыі эфектыўнасці навучання. Аналіз сучасных падыходаў да ацэнкі ведаў школьнікаў.

Дыферэнцыяцыя навучання: тэорыя, вопыт, перспектыва. Рознаўзроўневыя праграмы ў агульнаадукацыйнай школе і ў новых тыпах навучальных устаноў.

Праблемны падыход да навучання і яго месца ў вучэбным працэсе. Шляхі і формы індывідуалізацыі навучання школьнікаў ва умовах адукацыі ў Беларусі.

Тэхнічныя сродкі навучання, іх віды і спецыфіка выкарыстання. Праграмаванае навучанне. Камп'ютэр і навучанне.

### Спіс асноўнай літаратуры, неабходнай пры падрыхтоўцы да паступлення ў магістратуру


1. Закон Рэспублікі Беларусь "Аб адукацыі у Рэспубліцы Беларусь" (1991 г.) // Настаўніцкая газета. -- 1991. -- 23 ліст.

2. Закон Рэспублікі Беларусь "Аб правах дзіцяці" (1993 г.) // Адукацыя і выхаванне. -- 1994, №2. -- С. 39--47.

3. Конвенция о правах ребенка (1989 г.): Сб. документов по правам человека. -- Минск: МНО Республики Беларусь, 1991. -- С. 19--40.

4. Канцэпцыя адукацыі і выхавання у Беларусі (1993 г.) // Адукацыя і выхаванне. -- 1993, №12. -- С. 119--152.

5. Канцэпцыя выхавання у нацыянальнай школе Беларусі (аутар У.Ф. Валадзько). -- Мінск: НІА, 1993. -- 15 с.

6. Нацыянальны план дзеянняў па абароне правоў дзяцей. Зацверджаны Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь №150 ад 19 красавіка 1995 г. -- Мінск, 1995. -- 12 с.

7. Стратэгія рэфармавання сістэмы адукацыі і выхавання. -- Мінск: НІА, 1995. -- 9 с.

8. *Андреев В.И.* Система образования в Японии. -- Минск: НИО, 1995. -- 121 с.

9. *Богданович А.Е.* Педагогические воззрения белорусского народа // Антология педагогической мысли Белорусской ССР / Сост. Э.К.Дорошевич и др. -- М.: Педагогика, 1986. -- С. 234--235.

10. *Борейша И.А.* Формирование первичного трудового коллектива учащихся ПТУ: Учеб. пособие. -- Минск: БелНИИ образования, 1992. -- 76 с.

11. *Будный С.* Катехизис для детей... // Антология педагогической мысли Белорусской ССР / Сост. Э.К.Дорошевич и др. -- М.: Педагогика, 1986. -- С. 69--72.

12. *Валадзько У.Ф.* Выхаванне школьнікаў. -- Мінск: НІА, 1993. -- 213 с.

13. *Валадзько У.Ф.* Рэформа адукацыі і выхавання. -- Мінск: НІА, 1995. -- 67 с.

14. *Гавриловец К.В.* Воспитание человечности. -- Минск: Нар. асвета, 1985. -- 183 с.

15. *Гавриловец К.В., Казимирская И.И.* Морально-эстетическое воспитание школьников. -- Минск: Нар. асвета, 1987. -- 164 с.

16. *Грымаць А.А., Катовіч Н.К.* Фарміраванне нацыянальнай самасвядомасці будучых педагогаў. -- Мінск: НІА, 1996. -- 154 с.

17. *Кабуш В.Т.* Воспитание школьников в условиях обновления общества. -- Минск: Белфонд "Мы -- детям", 1994. -- 182 с.

18. *Капранова В.А.* Частная школа. -- Минск: НИО, 1995. -- 111 с.

19. *Караковский В.А.* Стать человеком: Общечеловеческие ценности -- основа учебно-воспитательного процесса. -- М.: НИО "Творч. педагогика", 1993. -- 80 с.

20. *Колас Я.* Методика родного языка. Уважайте и любите свой родной язык // Антология педагогической мысли Белорусской ССР / Сост. Э.К.Дорошевич и др. -- М.: Педагогика, 1986. -- С. 315--318.

21. *Колас Я.* Другое чытанне для дзяцей беларусау. (Любое выданне.)

22. *Коломинский Я.Л., Панько Е.А.* Диагностика педагогического взаимодействия. -- Минск: НИО, 1993. -- 135 с.

23. Концептуальные основы общеобразовательной средней школы с 12-летним сроком обучения: Тез. докл. Междунар. науч.-практич. конф. -- Минск: НИО, 1995. -- 180 с.

24. *Коменский Я.А.* Великая дидактика // Избр. пед. соч.: В 2 т. -- М.: Педагогика, 1982. -- Т. 1. -- С. 242--476.

25. *Корчак Я.* Как любить ребенка: Книга о воспитании / Пер. с польск. -- М.: Политиздат, 1990. -- 493 с.

26. *Кочетов А.И.* Как заниматься самовоспитанием. -- Минск: Нар. асвета, 1992. -- 256 с.

27. *Крайко Э.Н.* Система образования во Франции. -- Минск: НИО, 1995. -- 112 с.

28. *Кудринский Ф.А.* О воспитании и обучении // Антология педагогической мысли Белорусской ССР / Сост. Э.Е.Дорошевич и др. -- М.: Педагогика, 1986. -- С. 245--252.

29. *Латыш Н.И.* Образование на рубеже веков. -- Минск: НИО, 1994. -- 157 с.

30. *Левко А.И.* Социальные проблемы образования: История и современность: В 2 ч. -- Минск: НИО, 1993. -- 194 с.

31. *Лесгафт П.Ф.* Семейное воспитание ребенка и его значение // Избр. пед. соч. -- М.: Педагогика, 1988. -- С. 16--228.

32. *Макаренко А.С.* Проблемы воспитания в школьном коллективе // Коллектив и воспитание личности. -- М.: Педагогика, 1982. -- С. 115--284.

33. *Макаренко А.С.* Некоторые выводы из моего педагогического опыта: О моем опыте // Пед. соч.: В 8 т. -- М.: Педагогика, 1984. -- Т. 4. -- С. 230--266.

34. *Макаренко А.С.* Книга для родителей. (Любое издание.)

35. Новые технологии воспитательного процесса / Шуркова Н.Е. и др. / Под общ. ред. В.А.Караковского. -- М.: МП "Новая школа", 1994. -- 112 с.

36. *Пальчевский Б.В.* Системы и элементы учебно-методического обеспечения. -- Минск: Вышэйш. школа, 1986. -- 107 с.

37. *Пархоменко В.П.* Творческая личность как цель воспитания. -- Минск: НИО, 1994. -- 160 с.

38. *Полоцкий С.* Букварь языка словенска. Псалтырь в стихах. (Любое издание.)

39. *Протчанка В.У.* Адукацыя, школа, нацыянальная культура // Пачатковая школа. -- 1993, №1. -- С. 7--10.

40. *Протчанка В.У.* Навучальны працэс -- не канвеер: Аб некаторых праблемах і прынцыпах арганізацыі адукацыі у сельскай школе // Народная асвета. -- 1994, №5. -- С. 3--7.

41. *Протчанка В.У.* Пачатковая сельская школа напярэдадні рэформы // Пачатковая школа. -- 1995, №4. -- С. 6--8.

42. *Рачинский С.А.* Сельская школа. -- М.: Педагогика, 1991. -- 176 с.

43. Руссо Ж.-Ж. Эмиль, или О воспитании // Пед. соч.: В 2 т. -- М.: Педагогика, 1981. -- Т. 1. -- С. 19--592.

44. *Савельева Т.М.* Тэарэтычныя пытанні развіццёвага навучання у сістэме бесперапыннай адукацыі // Адукацыя і выхаванне. -- 1995, №6. -- С. 80--87.

45. *Салееу.В.А.* Этнапедагогіка і эстэтычнае развіццё асобы. -- Мінск: НІА, 1994. -- 181 с.

46. *Серкутьев Г.В.* Организация учебно-воспитательного процесса в ПТУ: Новые подходы. -- Минск, 1992. -- 137 с.

47. *Скорина Ф.* Библия русская. Малая подорожная книжица. Апостол. (Любое издание.)

48. *Сманцер А.П.* Педагогические основы преемственности в обучении школьников и студентов. -- Минск: БГУ, 1995. -- 299 с.

49. *Сухомлинский В.А.* Как воспитать настоящего человека. Рождение гражданина. Сердце отдаю детям. Мудрость родительской любви. (Любые издания.)

50. *Тётка (Алоиза Пашкевич).* Как нам учиться. К сельской молодежи белорусской. Берегите родное слово // Антология педагогической мысли Белорусской ССР / Сост. Э.К.Дорошевич и др. -- М.: Педагогика, 1986. -- С. 261--263.

51. *Цётка (Алаіза Пашкевіч).* Першае чытанне для дзетак беларусау. (Любое выданне.)

52. *Ушинский К.Д.* Человек как предмет воспитания: Опыт педагогической антропологии // Пед. соч.: В 6 т. -- М.: Педагогика, 1990. -- Т. 5, 6.

53. *Ушинский К.Д.* Труд в его психическом и воспитательном значении // Пед. соч.: В 6 т. -- М.: Педагогика, 1988. -- Т. 2. -- С. 8--26.

54. *Ушинский К.Д.* О народности в общественном воспитании // Пед. соч.: В 6 т. -- М.: Педагогика, 1988. -- Т. 1. -- С. 194--256.

55. *Ушинский К.Д.* О пользе педагогической литературы // Пед. соч.: В 6 т. -- М.: Педагогика, 1988. -- Т. 1. -- С. 160--176.

56. *Харламаў І.Ф.* Этычныя веды: роля у развіцці маральнасці і паводзін асобы // Адукацыя і выхаванне. -- 1995, №4. -- С. 60--73.

57. *Чэчат В.У.* Педагогіка сямейнага выхавання. -- Мінск: НІА, 1995. -- 195 с.